АРК

Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 2(52) 2007

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія

Галоўны рэдактар:
П. Дз. Кухарчык

Рэдакцыйная калегія:
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Лістапад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Новік
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
В. Б. Таранчук
А. І. Таўгень
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
А. С. Цернавы
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
М. Г. Ясавееў

Змест

Гісторыя

Елізараў С.А. Тэрыторыя і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне ССРБ у 1919 г. 3

Даніловіч В.В. Моладзь у грамадска-палітычным жыцці ССРБ у 1922 г. 8

Цуба М.В. Кірункі грамадска-палітычнай працы некаторых яўрэйскіх арганізацый у Беларусі падчас Першай сусветнай вайны (1914 – люты 1917 г.) 13

Раюк А.Р. Нефармальная структура беларускага грамадства ў XVIII – першай палове XIX ст. 15

Барадзіна М.С. Змяненне курсу развіцця пачатковай школы ў Беларусі ў 1863–1865 гг. 19

Кудраўцава С.А. Да пытання аб ролі язычніцтва ў грамадска-палітычнай сістэме раннедзяржаўнай Беларусі 23

Мячыкава І.І. Індаеўрапейскі міжкультурны генезіс сімвальных знакаў усходнеславянскага архітэктурнага дэкору 27

Малюгін А.І., Кавяка І.І. Культ Гора Бехдэцкага: да пытання аб месцы зараджэння 31

Столяр Дз.М. Дзейнасць спецыяльных атрадаў і груп па арганізацыі і развіцці партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці 34

Варывончык І.В. Сярэдні клас у палітыцы адміністрацыі Б. Клінтана 38

Старычонак В.В. Адміністрацыя Б. Клінтана, Кангрэс, грамадская думка і ўдзел ЗША ва ўрэгуляванні баснійскага крызісу (1992–1995 гг.) 42

Кушнер Н.В. Суфражысцкі рух у ЗША (1848–1920): узнікненне, станаўленне, развіццё 47

Субоцін А.Г. Тэрытарыяльная рэформа рэйха як аб'ект федэратыўнай дыскусіі ў гады Веймарскай рэспублікі 51

Філасофія

Кхамліш Кхалід. Сучасная сацыяльна-філасофская і палітычная думка Усходу аб узаемаадносінах з заходняй цывілізацыяй 56

Красюк У.Ф. Сістэмная арганізацыя матэрыі: аналіз анталагічных дыспазіцый 60

Паліталогія

Клачко П.А. Палітычная сацыялізацыя і асаблівасці дзейнасці моладзі ў палітычным асяроддзі 64

Касцючкоў А.М. Палітычны імідж: паняцце, прыметы, віды 67

Пузыроў Дз.А. Уплыў рэлігіі на развіццё сістэмы міжнародных зносін 71

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[2]. Mellaart, J. Excavation at Hajilar / J. Mellaart. – Edinburgh, 1970.

Summary

The classification of graphic symbols are studied in the frame of archaic Indo-European cultures that constituted East-Slavic architecture geometric ornament. On base of structural analysis the evolution of different systems of graphical symbols are traced. It is shown that Iindo-European symbols have solid historical successive connections. The Slavic symbols are originated from symbols of Tchernyakhovsky archaeological culture.

УДК 930.8

А.І. Малюгін, І.І. Кавяка

КУЛЬТ ГОРА БЕХДЭЦКАГА: ДА ПЫТАННЯ АБ МЕСЦЫ ЗАРАДЖЭННЯ

Уводзіны. Вобраз бога Гора – адзін з самых вядомых у егіпецкай міфалогіі. На працягу амаль усей гісторыі старажытнага Егіпта. Гор з'яўляўся апекуном улады фараона, а сам фараон быў увасабленнем бога Гора на зямлі. На шматлікіх рэльефах, дзе адлюстраваны дзеянні кіраўніка дзяржавы, мы бачым і сокала – птушку, якая лічылася ўвасабленнем Гора ў жывёльным свеце. У вобразе сокала часта рабілі выявы і самаго фараона, да таго ж імя Гора было абавязковым кампанентам афіцыйнай пяцічленнай тытулатуры любога фараона. Гор, або Хор, азначае «горны», «нябесны» (слова *hrt* – «неба»). На аснове гэтага можна зрабіць вывад аб тым, што ўвасабленнем Гора ў жывёльным свеце лагічна было зрабіць сокала [1, с.133].

Гістарыяграфія разглядаемагага пытання прадстаўлена ў асноўным замежнымі выданнямі. Так, англійскі егіптолаг А. Гардзінер прысвяціў вывучэнню культу дадзенага бажаства манаграфію «Гор Бехдэцкі» («Horus the Behdetite»). Нават ён звярнуў увагу на праблему паходжання Гора Бехдэцкага. Вучоны адзначыў, што ў Егіпце існавала два гарады Бехдэт – адзін у Верхнім, а другі – Ніжнім. А. Гардзінер адносіць зараджэнне культу дадзенага бажаства да Дэльты, галоўным аргументам на карысць гэтага сцвярджання ён лічыць той факт, што Бехдэт Дэльты першапачаткова называўся Бехдэтам, у той час як Бехдэт Верхняга Егіпта да часоў Сярэдняга царства быў вядомы як Джэба. Сам тэкст міфа пра Гора Бехдэцкага, высечаны на сценах храма ў Эдфу, быў упершыню перакладзены і пракаменціраваны англійскімі егіптолагамі А. Блэкманам і К. Фэрманам у іх агульнай працы «Міф пра Гора ў Эдфу» («The Myth of Horus at Edfou»), якая была апублікавана ў 1942 г. Пераклад дадзенага міфа на рускую мову быў выкананы М.Э. Мацье і змешчаны ў яе кнізе «Древнеегипетские мифы», якая ўбачыла свет у 1956 г.

З выхадам у свет перакладаў тэксту міфа сярод егіптолагаў узніклі рознагалоссі ў інтэрпрэтацыі выкладзеных там падзей. Англічанін П. Ньюберы, нямецкія вучоныя К. Зэтэ і Х. Хол лічылі, што эпізоды міфалагічнай барацьбы Гора і Сэта ўтрымліваюць сведчанні аб гістарычных падзеях мінулага. Яны схіляюцца да думкі, што міф можна разглядаць як адлюстраванне рэальных падзей напярэдадні аб'яднання Егіпецкай дзяржавы ў адзінае цэлае. Англійскі егіптолаг Дж. Грыфітс таксама прызнае магчымасць утрымання ў міфалагічным сюжэце спасылак на канкрэтныя гістарычныя падзеі, але лічыць, што іх варта аднесці да часоў II пераходнага перыяду. Грыфітс у сваёй працы «Інтэрпрэтацыя міфа аб Горы з Эдфу» («The Interpretation of the Horus-Myth of Edfou») выказвае меркаванне, што міф зафіксаваў падзеі пачатку XVI ст. да н. э., а менавіта выгнанне гіксосаў з Егіпта і ўзнаўленне ўлады егіпецкіх фараонаў ў краіне.

Сярод савецкіх даследчыкаў дадзенага пытання варта адзначыць М.Э. Мацье і М.А. Карастоўцава. Апошні прысвяціў разгляду культу Гора Бехдэцкага XIII главу сваёй манаграфіі «Религия Древнего Египта». У сваіх поглядах М.А. Карастоўцаў у цэлым салідарны з А. Гардзінерам. Праблему зараджэння культу Гора Бехдэцкага і варыятыўнасці інтэрпрэтацый эдфускага міфа савецкі егіптолаг да канца не вырашае, прызнаючы гэта пытанне спрэчным і патрабуючым дадатковай распрацоўкі.

Такім чынам, у дадзенай працы мы паспрабуем вырашыць пытанне паходжання Гора Бехдэцкага на падставе аналізу міфа, а таксама з улікам вынікаў ужо праведзеных даследаванняў. Мы лічым вырашэнне дадзенага пытання важным пры даследаванні праблемы аб'яднання Егіпта. Асноўным аргументам на карысць гэтага з'яўляецца адлюстраванне фараона-аб'яднальніка ў вобразе сокала – сімвала Гора, а пазней і ўлады фараона ўвогуле.

Асноўная частка. Неабходна заўважыць, што вобраз бога Гора быў вельмі разгалінаваны. Ён уключаў у сябе і Гора – брата Сэта (Гарур), і Гора – сына Ісіды і Асірыса [2, с.153–160],

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гора-мерці (Гор-вочы), Гора-бязвокага, Гора абодвух гарызонтаў (Гарахці) і Гора Бехдэцкага [1, с.133]. Найбольш карысную інфармацыю аб апошнім з іх мы атрымалі з тэксту міфа, высечанага на сценах храма ў Эдфу. Эдфу (ст.-егіп. Джэба, або Бехдэт) – гэта горад у Верхнім Егіпце, у якім і знаходзіцца храм Гору Бехдэцкаму. Міф аб Горы Бехдэцкім (далей гаворка будзе весціся толькі аб дадзеным вобразе Гора, яго будзем называць проста Горам) уяўляе сабой рэлігійную драму з наступным зместам: Гор суправаджае ў Нубіі вялікага бога-цара Ра-Гарахці, які ўзначальвае незлічонае войска. Раптам Гор убачыў ворагаў Ра, і апошні дазваляе Гору іх знішчыць: «О Гор Бехдетский, о Сын Ра, о величественный, вышедший из меня, уничтожь немедля врагов, что пред тобою» [2, с. 91]. Гор атрымаў бліскучую перамогу над ворагамі Ра і ў вобразе Крылатага Дыска вярнуўся ў ладдзю Ра. У выніку бітвы Гор бярэ ў палон галоўнага ворага Ра, паводле дадзенай версіі міфа – Сэта, якога пасля аддае на суд Гору, сыну Ісіды. Той, параіўшыся з маці, вырашае адпомсціць Сэту за забойства свайго бацькі Асірыса і адсякае яму галаву [2, с. 91–104].

Другая частка гэтага міфа ўяўляе з сябе містэрыю, якая арганізоўвалася ў храме кожны год, на дваццаць першы дзень другога месяца зімы, 21 мехіра, гэта значыць у першай палове студзеня [1, с. 135]. Варта заўважыць, што гісторыкі па-рознаму тлумачылі міф пра Гора Бехдэцкага. Так, ужо вядомы нам англійскі егіптолаг Ньюберы лічыць, што гэты міф з'яўляецца адлюстраваннем рэальных падзей, паколькі у самым пачатку ўтрымлівае канкрэтную дату: «В году 363 Ра-Гарахути, живущего вечно и навеки» [2, с. 91]. Але 363 гады кіравання прыймальны толькі для бессмяротнага бога-цара. Тут мы сустракаемся са з'явай падобнай да той, што ўтрымліваецца ў Турынскім папірусе, дзе ў спісе фараонаў, якія кіравалі на зямлі да людзей, тэрмін кіравання асобных дасягае тысячы год (цар Скарпіен кіраваў з 3500 па 2700 гг. да н. э. [3, с.146]). Менавіта з-за гэтага і не было магчымым уявіць гэтых багоў-фараонаў як рэальна існаваўшых кіраўнікоў. Варта ўспомніць таксама і пункт погляду нямецкага егіптолага К. Зэтэ. На яго думку, у пачатку энеаліта Верхні Егіпет мог уяўляць сабой царства Сэт, у той час як Дэльта магла ўключаць у сябе заходнія аб'яднанні номаў, якія супрацьстаялі ўсходняму аб'яднанню. Асірыс, цар Поўначы, мог аб'яднаць гэтыя два рэгіёны, а затым яго сын Гор заваяваў царства Сэт і ўтварыў аб'яднаную манархію, якая, такім чынам, магла існаваць на тэрыторыі ўсяго Егіпта яшчэ ў пачатку IV тыс. да н. э. Гэта манархія, верагодна, хутка прыйшла ў заняпад і раскалолася на дзве. Паўднёвае царства са сталіцай у горадзе Эль-Каб супрацьстаяла Паўночнаму, сталіца якога знаходзілася ў горадзе Бута. Да канца IV тыс. да н. э. з гэтых двух варагуючых царстваў утвараецца адзіная дзяржава на чале з Менэсам, царом Поўдня [3, с. 59–60].

Нягледзечы на высокую ступень распрацаванасці вобраза Гора Бехдэцкага ў егіпталагічнай літаратуры, вучоныя да гэтага часу не могуць прыйсці да згоды па пытанні аб паходжанні гэтага бога. Адзін пункт погляду заключаецца ў тым, што Гор родам з Верхняга Егіпта. Самы просты і ясны доказ гэтаму – храм у Эдфу. Сам Эдфу выступае перад намі як цэнтр пакланення Гору, шматлікія тэксты, знойдзеныя ў храме, сведчаць пра глыбокія карані культу бога ў дадзенай мясцовасці. Да таго ж па афіцыйнай версіі Верхні Егіпет аб'яднаў Ніжні ў канцы IV тыс. да н. э. і паклаў пачатак дынастычнай эпосе ў гісторыі краіны. На стэле Нармера фараон-пераможац адлюстраваны ў выглядзе сокала (вобраз Гора) [4], лагічным будзе і сцвярджэнне, што Гор з самага пачатку з'яўляўся апекуном Верхняга Егіпта.

Аднак пры аналізе міфа пра Гора Бехдэцкага, запісанага на сценах храма ў Эдфу, пытанне аб яго паходжанні становіцца спрэчным. Вядома, што акрамя Бехдэта, ў Верхнім Егіпце (Эдфу) існаваў яшчэ адзін Бехдэт, але ў Ніжнім Егіпце. Згодна з міфам пра Гора Бехдэтскага, больш старажытным з'яўляецца Бехдэт у Дэльце Ніла, а Бехдэт Верхняга Егіпта атрымаў сваю назву ў гонар перамогі Гора над ворагамі Ра ля гэтага горада. Да гэтага дадзены горад насіў назву Тэб: «И сказал Ра Тоту: "[Здесь свершилась расправа] с моими врагами"; и это место по сей день называется Теб… И Тот сказал: "Город Теб должен быть назван Гором Бехдетским» [2, с. 92]. Калі горад у Верхнім Егіпце атрымаў сваю назву ад Гора Бехдэцкага, то сам бог атрымаў сваё прозвішча ад горада Бехдэт у Дэльце, адкуль ён, магчыма, і паходзіў. Яшчэ адным доказам на карысць гэтай думкі з'яўляецца такі фрагмент першакрыніцы: «И сказал Ра Гору Бехдетскому: Эти враги поплыли вверх по реке в страну Сетет» [2, с. 101].

Рака – гэта Ніл, значыць плыць уверх па рацэ – плыць на поўдзень, у Верхні Егіпет, які і насіў імя ў гонар ворага Гора бога Сэта. Некаторыя гісторыкі таксама сцвярджаюць, што першапачаткова Гора ўшаноўвалі толькі ў Дэльце, а Сэта – на поўдні Егіпта [5, с. 200–201], іншыя ж навукоўцы толькі ўказваюць на магчымасць існавання такога факта [6, с. 310].

Варта адзначыць адну асаблівасць міфа пра Гора Бехдэцкага. У апісанні першай бітвы паміж Горам і ворагамі Ра адсутнічаюць спасылкі на якую-небудзь зброю, сказана толькі, што «в образе Крылатого Диска стал преследовать

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

[illegible] и атаковал с такой ужасающей силой, что [illegible], кто противостоял ему, не могли ничего ни видеть, ни слышать и поубивали друг друга» [2, с. 91]. За гэтай часткай міфа ідзе наступная, не [illegible] звязаная па сэнсе з папярэдняй. Зноў выходзіць ворагі Ра, і Гор зноў іх перамагае. Такія [illegible]-сюжэты з падобным зместам складаюць [illegible] міф. Асаблівасць апісання другой і ўсіх наступных бітваў у тым, што ў іх пачынае выкарыстоўвацца жалезная зброя: «металлическое копье и цепь…было железное копье и цепь… [illegible] в него свое железное копье», да таго ж у Гора з'яўляюцца «приверженцы-кузнецы» [2, с. 99–100]. Зразумела, што пра жалеза ў дадынастычную эпоху і не ведалі. Выкарыстанне метадычнага жалеза ва ўпрыгожваннях адносіцца да часоў Новага царства, а шырокае распаўсюджванне жалезнай зброі адбываецца толькі ў Позні перыяд. Хутчэй за ўсё, усе наступныя часткі міфа былі дапісаны пазней, магчыма, пасля выгнання гіксосаў або ў смутныя часы Позняга царства. Як вядома, у часы II пераходнага перыяду гіксосы, захапіўшы поўнач краіны, зрабілі Сэта сваім вярхоўным богам. Апісанні бітваў Гора з Сэтам і «Себау-демонами» [3, с. 98] з'яўляюцца хутчэй адлюстраваннем падзей, якія папярэдзічалі вызваленню Егіпта ад іншаземцаў.

Асноўныя падзеі раптоўна перамяшчаюцца з поўдня на поўнач, усе наступныя бітвы адбываюцца на азёрах Дэльты: «Тогда поднялись пред ним враги у Северного озера и лица их были обращены к Уадж-ур (Міжземнае мора. – аўт.), куда они хотели бежать»[2, с. 95]. Натуральна, што захопнікі імкнуліся ўцячы туды, адкуль і прыйшлі, а гіксосы прыйшлі менавіта з поўначы, таму становіцца зразумелымі іх уцекі да Міжземнага мора. У той жа час перыяд Позняга царства быў насычаны барацьбой Поўначы і Поўдня, дакладней фінансавага цэнтра з Дэльтай, якая ўвесь час займала апазіцыйны Поўдню бок у палітычным жыцці. У цэлым нельга не звярнуць увагу на заблытанасць міфа і супярэчлівасць яго асобных частак. Успомнім, што старажытнаегіпецкія жрацы адрозніваліся імкненнем да дапісвання, перапісвання і ўласнай інтэрпрэтацыі падзей у міфах пад уплывам глыбінных змен ў палітычным жыцці краіны [7, с. 183]. Менавіта гэтым, а таксама высокім узроўнем талерантнасці ў краіне і тлумачыцца такая разгалінаванасць і заблытанасць розных сюжэтаў егіпецкай міфалогіі. Адзначым, што талерантнасць у Егіпце яскрава выявілася ў тым, што ніякая міфалагічная канцэпцыя, прынятая адной-чы, фактычна ніколі не адхілялася канчаткова [8, с. 63]. У выніку, больш раннія элементы і камбінацыі захоўваліся нараўне з больш новымі.

Магчыма, што і міф пра Гора Бехдэцкага ў адрыўнаце захаваўся толькі ў першай частцы яго апошняй «рэдакцыі», а астатняе было дапісана жрацамі ў эпоху Новага царства ці нават пазней з мэтай адлюстраваць барацьбу гіксосаў (у абліччы Сэта і яго дэманаў) з егіпецкімі фараонамі (у абліччы Гора) і ўсхваліць перамогу апошніх. Магчыма таксама, што дадзены сюжэт з'яўляецца адлюстраваннем барацьбы нубійцаў і царкоў Дэльты ў канцы VIII ст. да н. э. Да таго ж вядома, што спачатку Сэт не з'яўляўся ворагам Гора і не ўяўляў сабой злога і страшнага бога. Усе гэта прыйшло пазней, у эпоху Старажытнага царства, і было звязана з распаўсюджваннем культу Асірыса.

Аналіз жа першай часткі паказаў, што радзімай Гора Бехдэтскага з'яўляецца Дэльта. Паколькі вобраз Гора – адзін з найбольш старажытных, то, магчыма, яго сабіральны вобраз як сімвал ўлады фараона першапачаткова аформіўся ў Ніжнім Егіпце, а на поўдні доўгі час квітнеў культ Сэта. У сувязі з гэтым паўстае пытанне аб аб'яднанні краіны. Вядома, што Гор перамог Сэта і аб'яднаў Егіпет, але калі Гор быў царом Ніжняга Егіпта, то пад сумненне ставіцца і версія аб тым, што Поўдзень падпарадкаваў Поўнач і садзейнічаў утварэнню адзінай дзяржавы.

Заключэнне. Як бачым, у Егіпце здаўна існавала мноства вобразаў бога Гора. Адным з найбольш старажытных з'яўляецца вобраз Гора Бехдэцкага – апекуна ўлады фараона. На падставе першакрыніцы ўдалося высветліць, што яго культ узнік у Дэльце Ніла, а пасля быў перанесены ў Верхні Егіпет, у горад Эдфу. З часоў Сярэдняга царства Гор Бехдэцкі становіцца гарадскім богам Эдфу і асацыіруецца выключна з Верхнім Егіптам. Міф пра Гора Бехдэцкага, знойдзены на сценах храма Эдфу, вызначаецца заблытанасцю і супярэчлівасцю. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што розныя часткі міфа былі напісаны або дапісаны егіпецкімі жрацамі ў розныя часы. Так стане зразумелым варыятыўнасць трактоўкі егіптолагамі гістарычных падзей, адлюстраваных у дадзеным міфе. Цэнтральнае месца ў міфе займае барацьба Гора і Сэта, якая ў любым выпадку разглядаецца як барацьба Поўначы і Поўдня. Пытанне пра паходжанне культаў Гора і Сэта аднаўляе праблему аб'яднання Егіпта, якая з'яўляецца нявырашанай да канца і па сённяшні дзень. Гэты факт тлумачыцца тым, што фараон часта адлюстроўваўся ў вобразе Гора. Аднак пытанне аб уз'яднанні Поўначы і Поўдня патрабуе дадатковай распрацоўкі і асобнага разгляду. Дадзенае даследаванне будзе карысна пры вывучэнні станаўлення і ўзнаўлення дзяржаўнасці ў Егіпце ў розныя часы, паколькі выяўляе рэлігійную аснову канфліктаў Верхняга Егіпта і Дэльты на працягу ўсёй гісторыі краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура і крыніцы

1. *Коростовцев, М.А.* Религия древнего Египта / М.А. Коростовцев. – М.: Наука, 1976. – 336 с.
2. Легенда о Горе из Бехдета и Крылатом Диске // Бадж Э.А.У. Египетская книга мертвых: пер. с англ./ Э.А.У. Бадж. – М.: «Эксмо», СПб.: изд-во «Terra Fantastica», 2004. – 768 с.
3. *Веркуттер, Ж.* Древний Египет: пер. с франц. / Ж. Веркуттер. – М.: «Астрель», 2004. – С. 166.
4. Энеолит Египта // Древний Восток: иллюстрированный альбом с комментариями. – М.: «Полиграфкнига», 1937. – С. 266
5. Мифы народов мира // Энциклопедия. В 2 т. Т. 1./ гл. ред. С. А. Токарев. – М.: «Останкино», 1997. – 671 с.
6. *Соколова, З. П.* Животные в религиях / З. П. Соколова. – СПб.: Наука, 1998. – 214 с.
7. *Струве, В.В., Кацнельсон, И.С.* [и др.] Культура древнего Египта / В.В. Струве, И.С. Кацнельсон, Т.Н. Савельева; отв. ред. И.С. Кацнельсон. – М.: Наука, 1976. – 444 с.
8. Антес. Р. Мифология в древнем Египте / Р. Антес. // Мифологии древнего мира: пер. с англ. – М.: Наука, 1977. – 455 с.

Summary

The article observes the problem of Horus's of Behdet origin. We tried to find the real birthplace of the god, as there were two Behdets in Egypt: in the north and in the south of the country. The solution of this problem will be useful in further investigation of the question of the union way in ancient Egypt as Horus was one of the main symbols of pharaoh's power over two parts of the country. Given researeh is based on the legend of Horus of Behdet.

УДК 947.084.8

Дз.М. Столяр

ДЗЕЙНАСЦЬ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ АТРАДАЎ І ГРУП ПА АРГАНІЗАЦЫІ І РАЗВІЦЦІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ НА ТЭРЫТОРЫІ БАРАНАВІЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Значнай вяхой у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца дзейнасць атрадаў і груп, якія накіроўваліся з Вялікай зямлі для стварэння і пашырэння антыфашысцкага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Аналіз апублікаванай літаратуры паказвае, што ў большасці даследаванняў яна разглядаецца ўвогуле ў межах асвятлення выбранай праблематыкі. Адным з першых, хто сур'ёзна падышоў да асвятлення дадзенага пытання, быў П.П. Ліпіла [5]. Аўтар акцэнтаваў увагу на дзейнасці КП(б)Б па арганізацыі засылкі партызанскіх атрадаў і груп у першы год Вялікай Айчыннай вайны. Даследчык разглядаў дзейнасць вучэбна-аператыўнага цэнтра, Асобага беларускага збору, якія ажыццяўлялі падрыхтоўку і засылку шэрага груп арганізатараў падпольнага руху і партызанскай барацьбы, а таксама дыверсійных груп на акупіраваную тэрыторыю Беларусі.

Неабходна адзначыць даследаванне Н.А. Якубоўскага [10]. У яго працы змешчана шмат факталагічнага матэрыялу аб стварэнні і дзейнасці спецшкол Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) і Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР). Аднак даследчык не паказаў ролю НКДБ-НКУС і вайсковых органаў у развіцці партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

У 80-я гг. Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б было падрыхтавана і выдадзена трохтомнае даследаванне «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны», у якім таксама знайшла асвятленне дадзеная праблема [2].

У 90-я гг. з'явіўся шэраг публікацый, у якіх разглядаецца ўклад савецкіх спецслужбаў у станаўленне і развіццё партызанскага руху [1–2; 7–8].

Між тым у навуковай літаратуры праблема дзейнасці спецыяльных атрадаў і груп на тэрыторыі заходніх абласцей, у тым ліку і ў Баранавіцкай вобласці, не атрымала падрабязнай распрацоўкі. Па-за межамі навуковага асэнсавання засталіся адрозненні ў засылцы партызанскіх фарміраванняў з-за лініі фронту ў заходнюю і ўсходнюю часткі Беларусі. Вынікі нашых даследаванняў дазваляюць сцвярджаць, што гэтыя адрозненні з'яўляліся даволі істотнымі. У той час як на ўсходнюю частку Беларусі ішла масавая засылка спецыяльных атрадаў і груп (з 1941 г.), у Заходнюю Беларусь з самага пачатку трапілі і сталі дзейнічаць толькі асобныя групы [9, с. 90].

Аналіз гістарычных даследаванняў і архіўнага матэрыялу паказвае, што партыйныя і вайсковыя органы, а таксама НКДБ-НКУС пачалі дзейнасць па падрыхтоўцы атрадаў і груп для барацьбы ў нямецкім тыле літаральна з першых дзён вайны. Аднак неабходна адзначыць, што ва ўмовах хуткага наступлення нямецкіх войскаў адсутнічала магчымасць наладзіць іх якасную падрыхтоўку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ